6. Назавіце імя і прозвішча выдатнага дзяржаўнага дзеяча, які стаў адным са складальнікаў Статута.
7. Навошта людзям патрэбны законы?

Разгледзьце выяву Льва Сапегі на с. 69 вучэбнага дапаможніка. Вызначце, што сведчыць пра тое, што Сапега займаў высокую дзяржаўную пасаду.

Ці лічыце вы правільным прымаць закон або важнае рашэнне па сіле крыку? Магчыма, існуе іншы варыянт галасавання? Свой адказ растлумачце.

## 17—19. АДКУЛЬ ПАЙШЛІ НАЗВЫ НАШЫХ ГАРАДОЎ

Ужо ў 9—13 стагоддзях на землях Беларусі існавалі буйны́я гарады. У кожнага з іх свой лёс, сваё жыццё. Давайце пазнаёмімся з імі. Наша падарожжа пачнём з самага старажытнага беларускага горада.

**Полацк.** Полацк упершыню ўпамінаецца на старонках летапісу «Аповесць мінулых гадоў» пад **862 годам.**

Калі вы пабываеце ў Полацку, то ўбачыце вялікі горад. Ён знаходзіцца на рацэ Заходняя Дзвіна ў тым месцы, дзе ў яе ўпадае рака Палата́. Сюды некалі прыйшлі славяне, каб за-


Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытны Полацк

снаваць новае паселішча. Першыя славянскія жыхары гэтых зямель сталі звацца палачанамі. Летапісы паведамляюць, што з войскам вялікага кіеўскага князя палачане плавалі нават у Чорнае мора. Праз Полацк у старажытныя часы праходзіў вялікі гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Полацкія гандляры былі вядомы ў далёкіх краінах. Горад часта наведвалі і замежныя гандляры. Яны прадавалі свае тавары і куплялі тое, што выраблялі палачане. Слава аб Полацку разнеслася па ўсім свеце.

А Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Пакажыце на ёй Полацк і яго размяшчэнне на гандлёвым шляху «з ва-

Правообладатель Издательский центр БГУ

рагаў у грэкі». Параўнайце выявы старажытнага Полацка на с. 5 атласа і на с. 71 вучэбнага дапаможніка. Вызначце, што ў малюнках агульнае, а што адрозніваецца.

**Тураў.** На беразе ракі Прыпяць размясціўся горад Тураў. Упершыню ён згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 980 годам.

Назва Тураў, як мяркуюць гісторыкі, можа паходзіць ад імя князя, які кіраваў у землях дрыгавічоў. Сваё імя князь Тур атрымаў ад распаўсюджанай у той час у Еўропе жывёлы — тура. Жыхары Турава расказваюць такое паданне пра ўзнікненне горада.

Даўным-даўно на месцы Турава былі непраходныя лясы. Тут вадзілася шмат звяроў



Паляванне нашых продкаў на тура


Правообладатель Издательский центр БГУ

і птушак, а рэкі поўніліся рознай рыбай. Завітаў сюды са сваім войскам князь Тур. Аднойчы, вельмі стомлены, прылёг ён адпачыць. І сніць князь, што ляжыць ён на высокім возе, а вакол — шмат гарадоў. Прачнуўшыся, ён загадаў пабудаваць тут горад.

Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Пакажыце на ёй Тураў.

**Мінск.** У самым цэнтры Беларусі знаходзіцца яе сучасная сталіца — горад Мінск. Як ён узнік? Што тут было раней, у старажытныя часы? Упершыню Мінск (тады Менск) упамінаецца ў летапісе пад 1067 годам. У гэтым годзе адбылася бітва на рацэ Нямізе. Пра незвычайную вуліцу-раку вы ўжо ведаеце. А адкуль жа ўзяла наша сталіца назву? Наконт гэтага ёсць розныя меркаванні.

Даўняе паданне гаворыць, што некалі на тым месцы, дзе пазней вырас горад, пасяліўся млынар. Да яго людзі вазілі збожжа, каб перамалоць яго на муку. Некаторыя сталі сяліцца паблізу. Так узнікла паселішча. Млынара звалі Менеск. Адсюль нібыта і пайшла назва. Спачатку Менеск, потым Менск, а яшчэ пазней — Мінск.

Ёсць іншая думка. Згодна з ёю заезджыя купцы некалі мянялі тут свае тавары на вырабы мясцовых майстроў. Таму пачатковая назва горада паходзіць ад слова «мена» — мяняць.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Млынар Менеск

Многія сучасныя вучоныя мяркуюць, што наша сталіца ўзяла сваю назву ад наймення рэчкі Менкі. На яе берагах і пасяліліся нашы продкі. Раней яна была багатая на рыбу, якая звалася мень. Вось і атрымалася: мень, Менка, Менеск, Менск і, нарэшце, Мінск.

**Віцебск.** Працягнем наша падарожжа. Ад Мінска будзем рухацца да горада Віцебска. Ён пабудаваны на берагах Заходняй Дзвіны, дзе з ёю злучаецца меншая рэчка — Віцьба. Ну як не здагадацца, што горад узяў сваю назву ад гэтай рэчкі? Як ад Менкі — Менск, ці Мінск, так ад Віцьбы — Віцебск.

Паводле падання, аб якім згадваецца ў летапісе, Віцебск (або Відбеск, Віцьбеск) заснаваны ў 974 годзе. Зручнае месцазнаходжанне


Правообладатель Издательский центр БГУ

на гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» спрыяла хуткаму развіццю горада.

Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Знайдзіце на ёй раку, на берагах якой узніклі Полацк і Віцебск.

**Магілёў.** А далей мы з вамі адправімся ў горад Магілёў. Праз яго таксама працягнулася сіняя стужка вялікай ракі. Гэта — Дняпро. Яго воды, узяўшы пачатак у Расіі, бягуць па землях Беларусі, Украіны аж да Чорнага мора. Нашы далёкія продкі ўмелі выбіраць зручныя мясціны для сваіх паселішчаў.

Згодна з пісьмовымі крыніцамі — летапісамі, Магілёў быў заснаваны ў 1267 годзе. Як часта здаралася, усё пачалося з узвядзення княжацкага замка. Вакол замка, пад яго абаронай, пачалі сяліцца людзі. Так паступова і паўстаў горад.

Гэтым разам горад узяў назву не ад ракі. Людская памяць данесла да нас цікавае паданне. У даўнія часы там, дзе стаіць сучасны Магілёў, шумела векавая пушча. У самай яе гушчы, на беразе Дняпра, жыў Машэка. Была ў яго нявеста, якую ён вельмі кахаў. Князь сілком забраў прыгажуню ў свой замак. Але да замка не падступіцца. Аднаго разу Машэка перахапіў на лясной дарозе багатую карэту. У ёй разам з князем ехала Машэкава нявеста. Машэка забраў каханую з сабой.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзяўчына прызвычаілася да багатага жыцця ў князя і не хацела вяртацца да былога жаніха. Дачакаўшыся, пакуль Машэка ляжа адпачываць, яна забіла яго. Сябры пахавалі Машэку і насыпалі над ім курган. Тое месца сталі называць «Магіла льва».

Так гэта было ці не — хто ведае. Але адну з прыбярэжных гор, дзе некалі нібыта хаваўся Машэка, магілёўцы і цяпер называюць Машэкаўкай.

**Гомель.** Наступны пункт нашага падарожжа — Гомель, горад на высокім беразе ракі Сож. Тут знаходзілася адно з самых старажытных паселішчаў радзімічаў, якое паступова разраслося і ператварылася ў горад.

Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Пакажыце на ёй горад Гомель.

Кажуць, з даўніх часоў насупраць горада ўтварылася на рацэ вялікая мель. І людзі, сплаўляючы па Сожы лес у Дняпро, голасна папярэджвалі адно аднаго: «Го-го, мель!» Нібыта гэта і дало назву гораду.

У летапісах горад упершыню ўпамінаецца пад 1142 годам. Там ён называецца крыху інакш: Гомін, Гомій. Больш падобна да таго, што назва звязана з рэчкай Гамяюк, якая ўпадае тут у Сож. Аднак ці рэчка запазычыла назву ў горада, ці наадварот — сказаць цяжка.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

**Брэст.** А цяпер рушым у горад Брэст. Першыя летапісныя звесткі пра Брэст адносяцца да 1019 года. Ужо тады гэта быў важны гандлёвы цэнтр і моцная крэпасць.

Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Пакажыце на ёй горад Брэст.

Пра паходжанне гэтага горада кажуць вось што. Невядомы купец прабіраўся са сваім таварам праз палескія балоты і трапіў у непраходную дрыгву. Што рабіць? Здагадаўся ён абдзіраць бярозы і бяростаю высцілаць шлях. Так і выратаваўся. А само месца ў гонар бяросты-выратавальніцы назвалі Бярэсцем. Адсюль і сучасная назва — Брэст.

**Гродна.** Развітаўшыся са старажытным Брэстам, рухаемся ў Гродна. Па-даўнейшаму ён завецца Гародня. Гэтая назва, як і словы «гарадзішча», «горад», азначае агароджанае месца, умацаванае паселішча.

Упершыню Гродна згадваецца ў летапісе пад 1127 годам. Горад меў гандлёвыя сувязі з іншымі старажытнымі гарадамі. Гэтаму спрыяла тое, што заснаваны ён быў на беразе Нёмана. А Нёман нясе свае воды ў Балтыйскае мора.

Разгледзьце карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Знайдзіце на ёй горад Гродна.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Карысна ведаць



Магілёўская ратуша

Пачынаючы з 14 стагоддзя беларускія гарады набывалі права на самакіраванне. Першым такім горадам у нашай краіне стаў Брэст, а потым Гродна, Полацк, Мінск, Магілёў, Віцебск, Гомель. Кожны з гэтых гарадоў атрымаў свой герб. А ў цэнтры гарадоў на рынкавых плошчах былі пабудаваны **ратушы**. У гэтых будынках знаходзілася кіраўніцтва горада.

1. Калі ўпершыню на старонках летапісу згадваецца самы старажытны беларускі горад? Раскажыце, што вы ведаеце аб паходжанні яго назвы.
2. Як жыхары Турава тлумачаць паходжанне назвы свайго горада?
3. Якая з версій паходжання назвы Мінска падаецца вам больш праўдападобнай і чаму?
4. Што ўразіла вас у гісторыі з Машэкам?
5. Што ў гісторыі паходжання назвы горада Брэста нагадвае пра берасцяныя граматы?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** Прыгадайце назву ўсходнеславянскага племені, якое пасялілася там, дзе пазней узнік горад Гомель.
**7.** Што ў назве горада Гродна можа сведчыць аб яго ўзнікненні на месцы замка?




Старажытныя гарады Беларусі

**1.** Пакажыце на картасхеме «Старажытныя гарады Беларусі» ў вучэбным дапаможніку шлях нашага падарожжа па гарадах Беларусі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Растлумачце, якім чынам палачане ў старажытнасці маглі трапіць да Чорнага мора. Скарыстайцеся картасхемай на с. 16 вучэбнага дапаможніка.
3. Разгледзьце малюнак на с. 74 вучэбнага дапаможніка. Раскажыце адно з паданняў пра паходжанне назвы нашай сталіцы.
4. Падлічыце, карыстаючыся самастойна складзенай «стужкай часу», колькі гадоў гораду Мінску.

Даведайцеся аб часе ўзнікнення і паходжанні назвы вашага населенага пункта. Падрыхтуйце вуснае паведамленне.

## 20. ПАЧЫНАЛЬНІК КНІГАДРУКАВАННЯ

Мінула шмат стагоддзяў, пакуль у Беларусі з’явілася першая друкаваная кніга. Пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян стаў **Францыск Скары́на**.

Нарадзіўся Скарына ў канцы 15 стагоддзя ў Полацку. Пачатковую адукацыю атрымаў у сваім родным горадзе. Потым вучыўся ў польскім горадзе Кракаве ва ўніверсітэце. Тут атрымаў першую сваю вучоную ступень бакалаўра. Неўзабаве Францыск паспяхова здаў


Правообладатель Издательский центр БГУ